Віктар Карамазаў



...можа, гэта сапраўды ня вельмі істотна,
што мастак малюе?..

# І я ўспомніў...

***Навэлы***

## *МАРЦАВАЛІ КАТЫ*

*Мастакам Вішнеўскаму і Славуку*

Быў месяц марац. Не сакавік – марац. Бо ў гэты час па Менску, як і па ўсёй краіне, марцавалі каты.

Было сьнежна-сьнежна і чыста-чыста, бо сьнег усю зіму сыпаў ды падмярзаў, не сплываючы, і ў гэтай сьнежнай чысьціні каты схуднелі ад блуду, выстагналіся да хрыпаты, ажно вочы павыкатваліся з калматай поўсьці, паналіваліся жахлівай чырваньню.

На небе закрамянела поўня, пачыналася яшчэ адна марцовая ноч, калі з пад'езду шматпавярховіка ў адчыненыя дзьверы выйшлі Рэпка і Птушка, чорныя кошачкі, за імі выскачыў Маркіз, яшчэ нядаўна вясковы закарэлы дварнячок, а з восені сталічны вы-

глянцаваны кавалер, і за Маркізам – два вядомыя мастакі прыблізна адных гадоў, для маладзіц яшчэ не перасьпелыя, часова нават не жанатыя. Яны часьцяком хадзілі разам, бо ў дадатак да сяброўства мелі кватэры-майстэрні побач, праз сьцяну, і абодва маліліся аднаму богу, які апекаваў малюнак, графіку і мастакоў. Шмат выпала ім агульнага: калідорчык, прыбіральня, чарапочкі для Рэпкі, Птушкі і Маркіза, ды і самі Рэпка, Птушка і Маркіз.

Сышоўшы з ганку, мастакі спыніліся. З хвіліну глядзелі на чацьвераногіх сяброў, жадаючы нагадаць ім правілы самастойных паводзінаў, бо сьпяшаліся на адкрыцьцё мастацкай выставы і ўжо чулі, як на гаражы каля дома курняўкала нейчае кацінае здыхоцьце. Прыстойныя прыстойных гаспадароў кошачкі, ня глянуўшы ў бок распусты, пашнуравалі міма, хоць распуста быў прыгажун – блакітна-белы, у тоне завечарэлага сьнегу, з ультрамарынава-чорнымі вушкамі ды лапкамі. Маркіз, строгі мужык, прыпыніўся, гыркнуў, але прыгажун яго як не заўважыў, і ён патрухаў далей за сяброўкамі.

На вуліцы празьвінеў трамвай, і Мікола з Мікітам, як назавем, нарэшце, мастакоў, засьпяшаліся да яго, бо не хацелі спазьняцца на імпрэзу, дзе выстаўляліся выявы катоў, малюнкі іх баявога жыцьця, нават мусіў адбыцца парад жывых катоў, падфарбаваных і прычасаных у першакласных цырульнях і макіяжных. Была спакуса вывесьці на парад Рэпку ды Птушку, але ў чарнявак надарылася жалоба па мужным сябры Коці, які загінуў на самым пачатку марцаваньня. Валодзя выстаўляў ягоную графічную выяву, партрэт, дзе Коця глядзеўся невясёлым, нібы ў прадчуваньні свайго палёту з сёмага паверху на кошачку, што нечакана, калі ён сядзеў на балконе, каўкнула пад ім на тратуары.

Трамвай, у які пасьпелі ўскочыць Мікола і Мікіта, ледзь адышоў ад дому, як на вуліцы зьявіліся Рэпка, Птушка і Маркіз. Яны перайшлі вуліцу на другі бок і апынуліся ў вялікім парку.

Тым часам імпрэза зьбірала гасьцей. Яна мела яшчэ і тое непадабенства на звычайныя выставы, што чакала ня ўсіх, хто меў жаданьне прыйсьці, яе нават не рэкламавалі, сюды ішлі па запрашэньнях, а запрошаных было шмат: мастакі, што бралі рэй у выставе, ды таямнічае масонства, што выставу наладжвала і аплочвала. Кожнага, хто заходзіў, віталі двухногія каты ды кошачкі. Каты былі ў чорных смокінгах, белых каўнярах з чырвонымі, тонам бардо, мятлушкамі пад спраўнымі падбародкамі, у кожнага з-пад носу тырчалі, як у сапраўдных катоў, доўгія рэдкія вусы, а на галовах тырчма стаялі каціныя кароткія вушкі. Адпаведны выгляд мелі і кошачкі: вусы ды вушкі. З вячыста ўзьнятымі хвастамі паміж іх увіваліся чатырохногія, на шыях у каторых таксама красавалі мятлушкі, а на хвастах яшчэ і яркія банты: белыя, ружовыя, блакітныя.

Як кожнаму з гасьцей, Міколу і Мікіту паднесьлі на залочаным блюдзе вусы ды вушкі, прытачылі да належнага месца і пад хор катоў іх прынялі ў слаўнае кацінае племя. Мікіта падышоў да свайго афорту, а там, каля яго, двухногія – і кот, і кошачка.

– Мы радыя павіншаваць вас з цудоўнай работай, – прамовіла даволі смазьлівенькая яна.

– Нам вашыя каты да сэрца, у іх столькі гумару, – вымурлыкаў самавіты ён.

– І шмат праўды марцовага жыцьця, – хіхікнула яна.

– Мы іх купляем.

Мікіта ад прыемнай нечаканасьці ажно курняўкнуў. Адчуўшы, як гэта не да месца і не да твару саліднаму мастаку, ён пасьпяшаўся выправіць няёмкасьць прыстойным словам і паляпнуў:

– Дык ешце на здароўечка.

І яшчэ мацней сумеўся: ешце афорт? Якое глупства! Але перад вачыма блiснуў блакітны канверт, з якога тырчэлі зялёненькія ражкі. Праз тонкую паперу канверту прасьвечвалі партрэты Франкліна Рузьвельта, і ён згадаў адразу, як раніцай шукаў, у каго б перахапіць да палучкі, і не падстрэліў ані цэнту. Узяў, пакуль давалі, з рукі ката канверт, удзячна зірнуў на кошачку і ў яе на вуснах, пад вусамі, вострым вокам мастака прачытаў блудлівую ўсьмешку. Кіса глядзелася істотаю з афорту, якая ляжала сьпінкай на зламанай яліне, гарэзьліва паклаўшы пярэднюю белую, нібы ў рукавічцы, лапку на жываток, зьвесіўшы з дрэва пушысты хвост і ўскінуўшы ўгару заднія лапкі. Над ёю стаяў напагатове ў поўсьці тыгра Коця, узьняўшы на сваю ахвяру лапу і грозна азірнуўшыся: хто мне перашкаджае?..

Мікола, агледзеўшы выставу, затрымаўся перад сваім афортам. Ягоны Коця быў не ў масоўцы, як у Мікіты, тут быў партрэт, і ён выглядаў спакойным катом з буйной сьлязінаю ў правым воку. Сьлязою здавалася радзімка, якая лагчынкаю ля носа сьцякала і ў вусах гублялася. Ад яе быў і нораў у Коці: яна яму шчымела як журба, і ў неверагодных рыцарскіх учынках Коця шукаў спатолю сваёй журбе. Палюючы мышэй, ён драбнату ня браў, прыносіў на парог, каб усе бачылі, страшыдлаў пацукоў, і нават марцаваў ня як усе каты: з сёмага неба ляцеў на кошку, нібы стаяў на ўсіх чатырох, і разьлічыў дакладна – ў апошні момант, каб не адбегла, якраз бы на яе сеў. Толькі аднойчы здрэйфіў, калі накінуліся два бульдогі, — на дрэва ўскочыў. Ды і тады не задрыжэў. Пакуль мардаты кабялюга ды плюгавая сучка пад дрэвам шчэрылі клыкі, ён на іх, дурняў, спакойна паглядаў зьверху, а потым, улучыўшы момант, каменем зваліўся на закарак кабялю, учапіўся кіпцюрамі. Сабака заскакаў, як на агні, скуголячы, ды скінуць з сябе Коцю ня мог, і калі Коця сам помстаю здаволіўся, саскочыў з кабяля, той даў такога драла, усьлед за сучкаю, што болей ні яго, ні сучкі ў двары ніхто ня бачыў. Тут панаваў Коця.

Цяпер Мікола хоць і радаваўся за Мікіту, купцом ашчодранага, але сваю работу прадаць ня мог. Вывесіў, каб сьвет убачыў Коцю. Ды і ці знойдзецца купчына: сьляза-радзімка была ўсё ж бракам.

Па зале парадам прайшлі гожыя, у бантах ды серпаньціне, каты. Зрабіўшы колькі кругоў, яны падаліся ў суседнюю залу. Двухногія бяз меншых брацікаў ды сяστрычак сумна закурняўкалі, ім адгукнулася тая зала, і гэтыя рушылі туды. Там утварыўся бязладна-мітусьлівы хор, і тады яшчэ з адных дзьвярэй выкаціліся сталы, застаўленыя бутэлькамі і закусьсю.

– Панове!.. – узвысіўся ўрачысты барытон. – Вясна нам падарыла сьвята. Вы чуеце?.. Нас просяць наліць...

– За вясну ў прыродзе і ў нашых сэрцах!..

Ня ўсе слухалі, што барытон сьпяваў далей, хоць усе прыціхлі, каб чуць, напэўна, музыку віна ды крышталю. І тут прачнуўся жаночы голас:

– За катоў!.. За тое, каб у кожным з вас, мужчыны, жыў мужны закаханы Коця!..

Мікіта пазнаў сваю купчыху. Узяў са стала пляшку, аглядзеўся, шукаючы Міколу. Той аказаўся побач. Наліў у абедзьве чаркі да краёў, каб хлабызнуць за Коцю, як раптам – яшчэ каманда:

– За кошачак!..

Пад стольлю нешта храснула – сьвятло пагасла.

Ціша запанавала. Але ўсяго на момант, бо воля не выбірае паміж сьвятлом і цемрай. Мацней, як у сьвятле, сьпявалі, гаманілі, перагукаліся, мацней зьвінела шкло, буль-буль – лілося, ужо без каманды налівалі і пілі, хісталіся падлога, столь, са звонам сыпаўся на падлогу посуд, хто з кім – загадка цемры – яднаўся ў моцных пацалунках, каты раўлі, як бугаі, а кошачкі пранізьліва вішчэлі. Нехта схапіў, прыціснуў да сябе Міколу, чмокнуў у вусны, ён быў падумаў, што гэта Мікіта, ды вусны былі з парфумай. Схапіў перад сабою тое, што ішло да рук, ня тое – тую, ціскануў – пяшчота каўкнула і высьлізнула.

Акно, за якім зьзялі сьнег і поўня, плыло, нібы п’янае, і на фоне таго сьвятла Мікола заўважыў абрыс Мікіты з выразнай гарбінкаю на носе. І яшчэ абрыс танчэйшых лініяў. Памкнуўся да танчэйшых – схапіў... купчыху?!

Пад стольлю ўспыхнула сьвятло.

Мікола разгублена глядзеў на Мікіту, Мікіта – на Міколу. Купчыха вісела ў абодвух на плячах, абодвух па чарзе з зацягам дасыта цалавала ў вусны, зажмурваючы ад асалоды вочы. І гэта, і нешта іншае рабілася па зале – вясёлае. Самотны кот курняўкаў: купец шукаў купчыху – ужо без вусоў, з адным каціным вухам. Мікіта адвярнуўся, каб са стала ўзяць яшчэ бутэльку на траіх, але, калі з бутэлькаю вярнуўся, не было ні Міколы, ні купчыхі. Шукаў вакол сябе і не знаходзіў.

За акном на белым карнізе сядзелі чацьвераногія каты і кошкі. Ружовымі намёрзлымі насамі ўплішчыўшыся ў шкло, яны глядзелі ў залу. Рысачкі, пярэсьценькія, белыя. І дзьве чарняўкі.

Двухногія пакідалі выставу.

Першымі на вуліцу выходзілі каты, што мелі кошачак. Яны садзілі сябровак у лімузіны, сядалі побач самі і вырульвалі на асьветленую начнымі ліхтарамі вуліцу. Каты, якія машынаў ня мелі, зьнікалі непрыкметна са сваімі ці з чужымі кошачкамі.

Рэпка, Птушка і Маркіз стаялі воддаль ад машынаў і ад людзей, выглядалі ў весела-разьюшаным натоўпе сваіх гаспадароў, ужо забыўшы пра тое, што быў іх кроўны месяц – марац.

Ох і ах!.. – гэты марац, скрадзены двухногімі ў сваіх меншых брацікаў і сястрычак.

## *МОЙ ВяЛІКДЗЕНЬ*

На вуліцы, дзе мы сустрэліся, ён сунуў мне ў рукі прыгожы сшытак, які быў каталогам Міжнароднай выставы графікаў у Мюнхене. Я разгарнуў каталог і ўбачыў фота: шыкоўна-вусаты твар пад бездакорна белай шавялюраю – той самы, што і жыўцом у гэтую хвіліну ўсьміхаўся мне.

– Ты ўяўляеш?.. Я ў Мюнхен не набіваўся, немцы самі запрасілі ды яшчэ ўганаравалі. А дома ва ўпор глядзяць – не заўважаюць.

Ад пеністых вусоў патыхала нянаскім піўком.

З сумкі, што вісела на плячы, ён дастаў пачак графічных аркушаў, ахвотна расклаў іх перада мною на асфальце.

– Яшчэ цёпленькія. Тут – пяро, аловак, тут – акварэлька, тут – гульня разца па медзі. Складаная тэхніка.

Я ўглядаўся ў графічныя карункі то на адным аркушы, то на другім, а ён тым часам пастрэльваў насьцярожана-нясьцерпнымі вачыма і на свае работы, і мне ў твар, чакаючы, што я прамоўлю пра яго мастацтва, ды я ня ведаў, што сказаць. Спытаў:

– Ёсьць думка?.. Тэма?.. Вобраз?..

Ён спахмурнеў – не зразумеў:

– Сучаснае мастацтва – ня “што”, а “як”. Яшчэ ты скажаш: дай ідэю? Ні тэмы, ні ідэі. Ёсьць фарба і папера. Пляма на паперы. На пляму – шкло, прыцісьні – сама, як хоча, вольная, і піша, і малюе. Шкло адымі – чытай малюнак. Ну, так – загадкавы, складаны. А ты алоўкам, разцом, пэндзлем дадай свае акцэнты, удакладні і “што”, і “як”.

Я зачапіўся вокам за выпадковы аркуш, у ім спрабуючы заўважыць тое, што пачуў, а сябра перахапіў мой позірк, узяў аркуш і пад малюнкам вывеў шарыкам: “На памяць...”

Дадому вярнуўся з падарункам і на яго ў той дзень ня глянуў: навошта браў, калі не зразумеў ні думкаю, ні сэрцам? Але назаўтра, як выспаўся, сам праясьніўся, паклаў перад сабою аркуш і ў чырвонай пляме пазнаў твар чалавека. Былі і нос, і вочы, на адным воку – шкліна, у ёй – адбіткі казачных расьлінаў, на твары – салома, жаўтлява-сонечная пацяруха, пырскі шэрай фарбы ці закарэлай гразі, нібыта рабаціньне, у роце – камяк зямлі, дзярніна, на галаве тырчма зрудзелае валосьсе – іржэўнік, як бы і тулава на месцы – спружына пад галавою-яйкам, і рукі ўроскід, і быццам ногі. Спружына кудысьці несла чалавека – бег з усіх сілаў. А твар – павернуты ў процілеглы бок, назад, запырсканы гразёю ды чырвонай фарбай, наліты страхам ад драпежнай, з кіпцюрамі зьвера, лапы, што зьверху вісела над уцекачом.

І я ўспомніў ...

Вясна квітнела – пасьляваенная, у сорак шостым. Наша сям’я вярнулася з далёкага бежанства і свайго кута, тым больш гаспадаркі, хоць курыцы ці парсючка, як у іншых, ня мела, працаваў адзін бацька, мама хварэла, стол і на сьвяты бываў пусты, нішчымны, за хлебам, што давалі па прадуктовых картках, чаргу займалі зьвечару, выстойвалі ўсю ноч, а раніцай, калі ў краме адчынялі хлебнае акенца, зьяўляліся здаровыя

мужчыны, дзяцей адсоўвалі і не пускалі на сьвежы хлебны дух, пакуль самі не набіраліся буханак і па сваіх, і па чужых картках. Я хадзіў у чацьвёрты клас, сілы, каб утрымацца ў той чарзе, не хапала, на горла быў таксама слабак, і пад раніцу на зьмену мне прыходзілі старэйшыя, больш баявыя за мяне, сястра ці маці.

Надышла Пасха. Цётка Гапа, гаспадыня дома, дзе мы кватаравалі, дала мне чырвонае яйка, і з тым яйкам я пасьпяшаўся да крамы, каб раней, як стаць у чаргу па хлеб, камусьці пахваліцца сваім багацьцем. А там сышоўся гурт мужчынаў: адзін на мыліцах, без нагі, другі без рукі, з запраўленым за шырокі салдацкі рамень рукавом аблезлай, з жоўценькім медалём, гімнасьцёркі, яшчэ быў сьлепаваты, у акулярах, кінамеханік, якога ў гарадку ўсе ведалі, асабліва хлапчукі, бо ўсе ў той час хадзілі ў кіно, нават па шмат разоў на адзін і той жа фільм, і быў высокі чубаты ў бліщчастых афіцэрскіх ботах, у жаўтлявым, колерам падобным на вытаптаную пашу, кіцелі, на якім медалі ды ордэны брынчэлі з двух бакоў у два рады. Іх прыкмеціў мільтон: з-за крамы нечакана выйшаў – мужчыны хто куды. Большы гурт стаяў далей – ён скіраваў да тых. Усіх паразганяў і тады, зрабіўшы сваю работу, сам некуды сышоў. Мужчыны зноў пачалі зьбірацца, аглядаючыся, хаваючы пакуль што яйкі па кішэнях. Ужо і я таксама ведаў, што чырвонае яйка ды пасху ад улады трэба хаваць.

Мы, хлапчукі, у той час свае насы тачылі ўсюды, дзе заўважалі франтавікоў, лавілі кожнае іх слова, зьбягаліся на іх песьні пад трафейныя акардэоны ды губныя гармонікі, вачыма абмацвалі кожны медалёк на заношаных гімнасьцёрках, а дакурыць бычок з рукі франтавіка – курэц ці ня курэц – было і асалодай, і вышэйшым гонарам. І вось тут, ля крамы, я раптам апынуўся з вайскоўцамі ў адным гурце. Кожны трымаў у кулаку чырвонае яйка, кожны, нібы які чарадзей, выскаляў мацнейшы зуб, біў у яго яйкам, хто ціха-дробненька, хто моцна, слухаючы на гук. Стары трымаў у шырознай, нібы сподак, далоні аж некалькі яек, другой рукою браў іх па адным, мецiў жоўтым зубам, сморгаў, незадаволены, галавою, гэтак рабіў з наступным яйкам, браў кожнае другім і трэцім разам, ніяк ня мог па густу выбраць. Той, што ў кіцелі, чубаты, у бліщчастых ботах, перакладаў яйкі з кішэні ў кішэню, гуляў з імі ўсьляпкі, навобмацак, шукаючы мацнейшае. А першым у гурце глядзеўся інвалід, які прыгорблена ляжаў плячыма і грудзьмі на малых, не па сваім даўгаватым росьце, як на чужых, мыліцах. На шыі ў яго вісеў шлём танкіста, насыпаны ледзь не да верху біцікамі, а ў кулаку ён трымаў сіняе яйка, падсоўваў кожнаму, каб нехта аскароміў сваім чырвоным. Зрабіць гэта карцела ўсім ды ніхто не адважваўся – сваё і выстаўлялі, і хавалі.

– А можа, наліванка?

– Даю – каштуй. Як наліванка – садзі мне ёю ў лыч.

– А чаму сіняе?

– Спытай у маёй бабы. Цыбуля за доўгую зіму перавялася, а сінькі ў краме хапае.

– Наліванку цыбулевая фарба не бярэ.

– Шкарлупіна ўсюды адна, з-пад курыцы.

Ніхто нікому не даказаў і кожны зноў, разявіўшыся, іншы да сьмехаты па-дурному, зацята дзёўб зубам яйка то ў насок, то ў пятку. Бралі на зуб і сіняе. Хтосьці нясьмела працягваў у кулаку сваё, але і не даваў, каб квэцнулі.

– Дык сьмелага няма? Ну, гвардзейцы Сталіна! І хто браў той Берлін? – кіпеў інвалід на мыліцах. Даю шлём біцікаў, калі хто ўмажа. Ну?!.

Нарэшце гвардзеец аб’явіўся – чубаты ў кіцелі, у блішчастых ботах:

– Эх!.. Было ці не было!..

Усе вылупілі вочы, яму ў твар глянулі з павагай, як на самага сьмелага, чакаючы, што будзе далей: напэўна ж зараз выявіцца, там – наліванка ці не наліванка, смала ці без падману? І тут я не ўтрымаўся, падсунуў і сваё пад сіняе – хацелася ж таксама быць сьмелым, ды, можа, яшчэ і думка падбівала: раптам прываліць аж цэлы шлём біцікаў? Але, як толькі паднёс насок чырвоны пад сіняе, чубаты адразу квэцнуў ня сіняе — маё. Яно, маё, хрупнула, і я, гэта пачуўшы, аж здрыгануўся. А тут – каманда, каб яйка павярнуў другім бокам, угару пяткаю. Чубаты ўзьняў руку з сваім чырвоным, але яго чырвонага я ўжо ня бачыў: у вачах было ня яйка – была рука. Вялізная, з белымі маслакаватымі пальцамі, падобная на ўчэпістую лапу каршука. З гурту мужчынаў мяне як хтосьці выпхнуў. І як па галаве – цяжкім:

– Пацан!.. Ня руш закону!..

Цішэйшы голас, ужо за сьпіной, пачуўся за мяне:

– Дзіцёнка не чапай!..

А я ўжо бег – мяне гнаў страх. Бег брукам ад мужчынаў, ад крамы, забыўшы пра хлеб і пра чаргу. Брук пад нагамі з гары каціўся да маста цераз ручай, блішчаў ды мільгацеў у вочы, я сам каціўся то вільготна-блішчастым брукам, то жвірыстай, востра-калючай у тонкія падэшвы гумовых неданоскаў абочынай, а за мною, не аціхаючы, грукацеў падкаванымі ботамі, зьвінеў усімі сваімі медалямі чубаты. Я бег ды азіраўся, бачыў, што ён наганяе, але іншага ратунку, як шыбаваць з усяе моцы, ня ведаў. Блізка ўваччу падскокваў мост, пад якім хлопцы не аднойчы хаваліся з натрэсенымі ў чужых садах яблыкамі, і да яго хоць як, кроў з носу, трэба было дабегчы: мост мог уратаваць. Ды дзе ўжо тыя сілы? Грукат за сьпіною рабіўся ўсё мацнейшы. Я азірнуўся яшчэ раз, і ў гэты момант, мяне нагнаўшы, цяжэнны бот зьлёту ўрэзаў у зад. Праз белыя слупкі, што агароджвалі дарогу, я паляцеў у роў, па дне якога да маста, пад мост, бег, падскокваючы на камянах, вяснова-паўнаводны ручай. Плазам ляжаў у гразі, чуючы, як балюча ня толькі ў месцы, дзе прыклаўся бот, балела ўсё, што ўва мне, ня мог падняцца, але, узьняўшы голаў, убачыў свайго гвардзейца. Ён у гразь не пайшоў. Стаяў перад слупком, узьняўшы на яго нагу, і нечым белым, паперай ці анучкай, выціраў свой афіцэрскі бот.

За хатамі на горцы дагарала сонейка, было там яшчэ сьветла, а тут, у рове, у змроку, шумеў на камянях ручай, над ім у небе ўжо сачыўся празрысты рагаты месяц, вада ў ручаі блішчэла тым самым, што і ра-

галік, сьсінела-срэбным холадам. Нібы паранены сабака, я зашыўся ў хмыз над вадою, дзе можна было, схаваўшыся ад людскіх вачэй, адмыцца. Пад хмызам ляжалі камяні, дошкі, з іх я абмыў твар, не заўважаючы, што ўсё раблю адной левай рукою, што правая яшчэ ў кулаку сьціскала яйка. Я расшчапіў кулак – на далоні ляжаў шэры камяк з утаптанай у яго шкарлупінай. Паднёс да носу і выкінуў у ручай. Разуўся, выпаласкаў штаны, павесіў на хмыз, не здымаючы, каб не скалець зусім, замыў рукавы кашулі, усьцягнуў на сябе мокрыя штаны і ўжо сьцямнелым ровам босы, трымаючы абутак у руках, выйшаў на сьцежку, якая паўз платы межамі вяла дадому. Нікога не хацелася бачыць і хоць тут пашанцавала: на агародах не было нікога, наш двор таксама быў пусты, дзьверы ў сенцы і з сянец у хату незачыненыя, у хаце – ані душы, сьвятла яшчэ не запальвалі, як не было каму запаліць, але і тут, як у грудзях ды ў думках, хавалася – я гэта востра чуў – нешта трывожнае. Хтосьці блізка ўсё ж быў, бо грубка, прыробленая да печы, была напаленая, на пліце стаялі чыгуны, ад якіх па хаце ішла салодкая бульбяная пара. Я залез на ляжак, скінуў з сябе ўсё мокрае на гарачы чарэн і мне ўжо нічога не хацелася, акрамя як доўгага ў хаце змроку, цішыні ды цёплай пад бокам печы. Падсунуў пад галаву старыя, з пахам паленай воўны, валёнкі, усьцягнуў на плечы нейкае паліто і, мабыць, адразу заснуў. Як і калі прачнуўся – ня памятаў.

Затое цяпер, праз цэлае жыцьцё, ужо на яго схоне, жыва бачу і чую сэрцам, скураю, кожнай пад ёю костачкаю і тое жаданае на печы цяпло, і сабачую халадрыгу на ручаі ў рове, і той балючы, у зад, высьпятак, быццам толькі што прачнуўся пасьля чырвонага, з вялікодным яйкам, сьвята. Як бы яно было ўчора.

І нават мама тая, маладая, стаіць перада мною ў зьлінялай трыкатажнай, з бежанства прывезенай, кофце, трымае ў абедзьвюх руках белы, з сінім абручыкам, кубак, у якім цёплае малако ці зельле, глядзіць мне ў вочы, а ў самой у вачах – сьлёзы.

З таго дня я ўжо не страляў бычкі ў франтавікоў і нават не заглядаўся на іх бліскучыя іканастасы.

Дык, можа, гэта сапраўды ня вельмі істотна, што мастак малюе? Можа, больш істотна тое, што я, не мастак, бачу ў ягоным малюнку?

Вось – пляма. Усяго толькі – чырвоная. Камусьці, можа, яе і мала, а мне хапіла, каб з далечы гадоў убачыць ды зноў перажыць далёкі дзень пасьля вайны і тое гаркавае, з чырвоным яйкам у руцэ, сьвята.